# Нашыя аўтары

**Андруховіч Юрый** — паэт, празаік, эсэіст. Адзін з лідэраў актуальнай украінскай літаратуры. Аўтар трох паэтычных зборнікаў і трох раманаў. Адзін з заснавальнікаў літаратурнай суполкі «Бу-Ба-Бу» (1985-1996 гг.). Нарадзіўся ў 1960 г. Жыве на Украіне.

**Астравец (Астраўцоў) Сяргей** — празаік, публіцыст, журналіст. Аўтар кніг прозы «Янычары» і «Цэнзарскія нажніцы». Нарадзіўся ў 1959 г. у Менску. Жыве ў Гародні.

**Астраўцоў Алесь** — празаік, публіцыст. У нядаўнім часе — супрацоўнік часопісу «Крыніца». Аўтар шматлікіх публікацыяў на старонках «Крыніцы», «Нашай нівы» і інш. выданьняў. Нарадзіўся ў 1965 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Базылёва Вольга** — паэтка. Студэнт-ка факультэту журналістыкі Белдзяржуніверсітэту. Нарадзілася ў 1982 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Барабаншчыкава Вольга** – мастацтвазнаўца. Супрацоўнік тыднёвіка «ЛіМ». Аўтар шматлікіх публікацыяў на старонках беларускага друку па праблемах сучаснага мастацтва. Нарадзілася ў 1976 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Барадулін Рыгор** — народны паэт Беларусі. Паэт, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1976 г.). Аўтар кніг паэзіі «Маладзік над стэпам» (1959 г.), «Рунець, красавацьс, налівацца!» (1961 г.), «Нагбом»(1963 г.), «Адам і Ева» (1968 г.), «Рум» (1976 г.), «Вечалле» (1980 г.), «Евангелле ад мамы» (1995 г.) і інш. Нарадзіўся ў 1935 г. у в.Верасоўка на Ушаччыне. Жыве ў Менску.

**Васілеўскі Пётра** — публіцыст, мастацтвазнаўца. Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі Беларусі і беларускага мастацтва, якія друкаваліся ў зборніках і альманахах. Працуе ў тыднёвіку «Літаратура і мас-тацтва». Нарадзіўся ў 1954 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Васючэнка Пятро** – празаік, драматург, літаратуразнаўца. Кандыдат філалагічных навук. Аўтар кніг «Драматургія і час», «Белы мурашнік», «Прыгоды аднаго губашлёпа», «Драматургічная спадчына Янкі Купалы: Вопыт сучаснага прачытання» і інш. Нара-дзіўся ў 1959 г. у Полацку. Жыве ў Менску.

**Вярцінскі Анатоль** – паэт, драматург, журналіст, крытык, перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя П. Лепяшынскага (1988 г.). Аўтар кніг «Песня пра хлеб» (1962 г.), «Тры цішыні» (1966 г.), «Чалавечы знак» (1968 г.), «З'яўленне» (1975г.), «Ветрана»(1979 г.), «Нью – Йорская сірэна» (1987 г.), «Хлопчык глядзіць» (1992 г.) і інш. Нарадзіўся ў 1931 г. у в.Дзямешкава на Лепельшчыне. Жыве ў Менску.

**Галубовіч Леанід** — паэт, празаік, крытык. Аўтар кніг «Таемнасць агню», «Споведзь бяссоннай душы», «Зацемкі з левай кішэні», «апошнія вершы леаніда галубовіча». Нарадзіўся ў 1950 г. у в.Вароніна на Клеччыне. Жыве ў Менску.

**Геніюш Ларыса** – паэт, празаік. Аўтар кніг «Ад родных ніў» (1942 г.), «Невадам з Нёмана» (1967 г.), «На чабары настоена» (1982 г.), «Споведзь»( 1993 г.) і інш. З 1949 па 1956 год — адбывала «пакараньне» на Поўначы (Інта і Абезь Комі АССР). Выйшаўшы на волю, жыла ў Зэльве, на радзіме мужа, не прыняўшы савецкага падданства да самай сьмерці. Нарадзілася ў 1910 г. у маёнтку Жлобаўцы на Гродзеншчыне. Памерла ў 1983 г.

**Дранько-Майсюк Леанід** — паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Аўтар кніг «Вандроўнік», «Тут», «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасьць Парыжам» і інш. Нарадзіўся ў 1957 г. у Давыд-Гарадку. Жыве ў Менску.

**Зуёнак Васіль** – паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, крытык. Кадыдат філала-гічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1982 г.). Аўтар кніг паэзіі «Вясёлы калаўрот» (1965 г.), «Крэсіва» (1966 г.), «Крутаяр» ( 1969 г.), «Нача» (1975 г.), «Вызначэнне» (1987 г.), «Лета трывожных дажджоў» (1990 г.) і інш. Нара-дзіўся ў 1935 г. у в. Мачулішча на Меншчыне. Жыве ў Менску.

**Каржанеўская Галіна** – паэт, празаік, драматург, крытык. Аўтар кніг «На мове шчасця», «Мой сад», «Жыла – была», «На што падобна аблачынка?», «Вечны водгук», «Невымоўнае» і інш. Нарадзілася ў 1950 г. у в.Лясішча на Случчыне. Жыве ў Менску.

**Качаткова Паліна** — празаік, публіцыст, журналіст. Апавяданьні друкаваліся ў «ЛіМе», «Крыніцы», «Нашай ніве» і інш. выданьнях. Нарадзілася ў 1968 г. у Оршы. Жыве ў Менску.

**Конан Уладзімір** — філосаф, літаратуразнаўца, публіцыст. Доктар філасофскіх навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аўтар кніг «Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917-1934 гг.)», «Адам Бабарэка: Крытычна-біяграфічны нарыс», «Беларуская эстэтыка і мастацкая культура: Гістарычныя традыцыі і сучаснасць», «Святло паэзіі і цені жыцьця: Лірыка М.Багдановіча.» і інш. Нарадзіўся ў 1934 г. у в.Вераскава на Наваградчыне. Жыве ў Менску.

**Курчанкова Хрысьціна** — празаік. Студэнтка факультэту журналістыкі Бел-дзяржуніверсітэту. Нарадзілася ў 1979 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Мудроў Вінцэсь** — празаік. Аўтар кніг «Жанчыны ля басейна», «Гісторыя аднаго злачынства», «Зімовыя сны» і інш. Нарадзіўся ў 1953 г. у Полацку. Жыве ў Полацку.

**Сіўчыкаў Уладзімір** — паэт, празаік, публіцыст, перакладчык, драматург, мастак. Аўтар кніг «Гульня ў тастамант» і «Лісты да брата». Нарадзіўся ў 1958 г. у Жодзіна. Жыве ў Менску.

**Скобла Міхась** — паэт, парадыст, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча (2000 г.). Аўтар паэтычных кніг «Вечны Зьніч», «Вочы Савы», «Нашэсьце Поўні», кнігі гістарычных нарысаў «Дзярэчынскі дыярыюш» і інш. Нарадзіўся ў 1966 г. у в. Паляжын на Зэльвеншчыне. Жыве ў Менску.

**Сокалаў-Воюш Сяржук** — паэт, бард, перакладчык, журналіст. Аўтар кнігі паэзіі «Кроў на сумётах». Нарадзіўся ў 1957г. у в.Астроўшчына на Полаччыне. Жыве ў Чэхіі.

**Сьлінка Віктар** — паэт. Аўтар кніг паэзіі «Апошні сьнег» і «Штольні вясны». Нарадзіўся ў 1971 г. у г. Івацэвічы. Жыве ў Менску.

**Сьцяпан Уладзімір** — празаік, мастак. Аўтар кніг прозы «Вежа», «Сам-насам». Нарадзіўся ў 1958 г. у м. Касьцюкоўка на Гомельшчыне. Жыве ў Менску.

**Сыс Сяржук** — паэт, журналіст. Вершы друкаваліся ў альманаху «Тутэйшыя», «ЛіМе», «Крыніцы» і інш. выданьнях. Нарадзіўся ў 1962 г. ў в. Заспа на Гомельшчыне. Жыве ў Гомелі.

**Рублеўская Людміла** — паэт, празаік, крытык, драматург, нарысіст. Аўтар кніг паэзіі «Крокі па старых лесвіцах», «Адукацыя», «Замак месячнага сяйва», прозы «Міфы горада Б'» і інш. Нарадзілася ў 1965г. ў Менску. Жыве ў Менску.

**Тарас Віталь** — публіцыст, журналіст. Працаваў у тыднёвіках «Лім» і «Культура», цяпер супрацоўнік «Радыё Свабода». Нарадзіўся ў 1956 годзе ў Менску. Жыве ў Чэхіі.

**Хадановіч Андрэй** — паэт, перакладчык, літаратуразнаўца. Перакладае з ангельскай, французскай, польскай і ўкраінскай моваў. Аўтар кнігі паэзіі «Лісты з-пад коўд-ры» (у перакладзе на украінскую мову). Нарадзіўся ў 1973 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Чавусаў Юрый** – публіцыст. Аўтар шэрагу публікацыяў у рэспубліканскай прэсе. Асьпірант аддзяленьня паліталогіі БДУ. Нарадзіўся ў 1978г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Шаўцоў Сяргей** — публіцыст, журналіст. Працуе ў газеце «Звязда». Аўтар шматлікіх публікацыяў у рэспубліканскім друку па сацыяльна-эканамічных праблемах. Нарадзіўся ў 1960 г. у м. Церахоўка на Гомельшчыне. Жыве ў Менску.

**Ярац Віктар** — паэт, літаратуразнаўца, крытык. Кандыдат філалагічных навук. Аўтар кніг паэзіі «Уваходзіны», «Добрыца», «Дняпроўскі бакен» і інш. Нарадзіўся ў 1948 г. у в. Красны мост на Гомельшчыне. Жыве ў Гомелі.